Водзыў
аб аўтарэфераце дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча
«Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь»,
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук
па спецыяльнасці13.00.01 – агульная педагогіка,
гісторыя педагогікі і адукацыі

Аўтарэферат дысертацыйнага даследавання Панова С. В. па сваёй гісторыка-педагагічнай сутнасці і зместу адпавядае заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі. Саіскальнікам пры рэалізацыі мэты даследавання, арыентаванай на вызначэнне і абгрунтаванне канцэптуальных асноў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, сфармуляваны адпаведныя задачы, якія можна лічыць дасягнутымі. Канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі пазіцыяніруюцца у дысертацыі адносна адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы. Саіскальнікам вызначаюцца кампаненты такой сістэмы ў кантэксце яе вывучэння як інстытуцыянальна-ведамаснай і як сацыягуманітарнай з'явы. Зразумелым пры такой міждысцыплінарнасці даследавання з'яўляецца спалучэнне метадалагічных асаблівасцей гісторыі адукацыі як галіны педагагічнай навукі і метадалагічных прынцыпаў гістарычнага пазнання як галіны гістарычнай навукі.

Вызначальным з'яўляецца тое, што школьная гістарычная адукацыя храктарызуецца саіскальнікам як шматкампанентная і шматфактарная педагагічная сістэма. У дысертацыі ўдакладнены канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, зместава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны кампаненты школьнай гістарычнай адукацыі з адпааведнымі ім фактарамі. Упершыню ў навуковых даследаваннях па гісторыі адукацыі ў якасці дэтэрмінуючага фактара ахарактарызавана дзяржаўная гістарычная палітыка Рэспублiцы Беларусь, накіраваная на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці сродкамі школьнай гістарычнай адукацыі.

Варта дадаць, што сканструяваная і канкрэтызаваная саіскальнікам мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі мае дастаткова ўніверсальны характар адносна даследавання падобных ёй педагагічных сістэм.

У дысертацыі распрацавана перыядызацыя працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Дадзеная перыядызацыя ўключае ў сябе чатыры этапы, пачынаючы з Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі (1991 г.), і завяршаючы Канцэпцыяй школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь (2022 г.), рэалізацыя якой адбываецца ў сучасны перыяд. Пры распрацоўцы перыядызацыі саіскальнікам вызначаны сістэматызуючыя асновы: нарматыўна-прававое афармленне канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі ў трох

пакаленнях канцэпцый; стандартызацыя ў трох пакаленнях адукацыйных стандартаў; канструяванне зместу адукацыі ў пяці пакаленнях школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры; структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычным і лінейным прынцыпах; рэалізацыя культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў у іх пераемнасці; афармленне і рэалізацыя дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь. Магчыма было б абазначыць сучасны перыяд развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі як пяты этап.

Аналіз зместу аўтарэферата сведчыць, што саіскальнікам рэалізуецца пераемнасць пры вызначэнні тэндэнцый і перспектыў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы. Яны звязаны з эвалюцыяй канцэптуальнага мэтавызначэння ад захавання прадметацэнтрызму да арыентаванасці на развіццё асобы; з прынцыпамі абнаўлення зместу (антрапалагізацыі, культурна-гістарычнага асяроддзя, гістарычнай дыялагічнасці); з цыклічнасцю пры рэалізацыі канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу; з актуалізацыяй светапоглядна-выхаваўчай і кансалідуючай гістарычную памяць функцыяй адукацыі. Навуковая навізна даследавання школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з’явы, вызначаная саіскальнікам, перспектыўна звязана з рэалізацыяй нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі ў працэсе фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў і каштоўнасці дзяржаўнага сусверэнітэту, з удакладненнем прынцыпаў адбору зместу і інтэграцыяй гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Вызначальнай рысай даследавання можна лічыць міждысцыплінарнасць. Яна праяўляецца пры комплекснай характарыстыцы рэалізацыі ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі агульнапедагагічных падыходаў, у прыватнасці, культуралагічнага ў пераемнасці з кампетэнтнасным, а таксама метадалагічных падыходаў акадэмічнай гістарычнай навукі (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны), якія спалучаюцца з прадметна-гістарычнымі (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны). Сведчаннем міждыцыплінарнасці можна лічыць выкарыстанне саіскальнікам пры характарыстыцы канцэптуальных асноў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з’явы канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства. Вышэйзгаданыя канцэпты ўводзяцца ў зварот праз іх тэарэтычнае вызначэнне прадстаўнікамі сучаснага беларускага навукова-педагагічнага супольніцтва і з’яўляюцца інструментальнымі маркерамі для праведзенага саіскальнікам кантэнт-аналізу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі.

Відавочную актуальнасць дысертацыйнаму даследаванню надае ахарактарызаваная ў аўтарэфераце і распрацаваная з удзелам саіскальніка сацыяльна-педагагічная мадэль патрыятычнага выхавання вучнёўскай

моладзі. Уяўляецца своечасовым рэлізацыя дадзенай мадэлі пры ажыццяўленні Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг., якая спрыяе рэалізацыі светапоглядна-выхаваўчай функцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў адпаведнасці з дзяржаўнай гістарычнай палітыкай у Рэспубліцы Беларусь.

Дысертацыйнае даследаванне мае практычную значнасць, якая абумоўлена магчымасцю выкарыстання яго вынікаў у працэсее стварэння школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі. Панов С.В. з’яўляецца сааўтарам 19 вучэбных дапаможнікаў па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Варта адзначыць сацыяльную значнасць даследавання, звязаную з фарміраваннем у вучняў нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці как інтэграванай якасці асобы праз комплекснае прадстаўленне культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі, прыкладаў сацыяльных паводзін прадстаўнікоў беларускай нацыі, якія ў гістарычнай рэтраспектыве сведчаць аб іх нацыянальнай самасвядомасці і адпавядаюць намінатыўнай маркерызацыі «Нацыянальны герой» разам з існуючай намінацыяй «Нашы славутыя землякі». Сведчаннем фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці і гістарычнай памяці можна лічыць прыведзеныя ў аўтарэфераце вынікі анкетавання саіскальнікам эмацыянальна-каштоўнасных адносін настаўнікаў гісторыі да прадстаўнікоў беларускай нацыі, прадстаўленых у змесце школьнай гістарычнай адукацыі ў IX класе пры вывучэнні гісторыі Беларусі 1917 г. – пачатку XXI ст. Цікавай уяўляецца выснова аб захаванні настаўнікамі савецкага тыпу беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці як часткі сацыяльнага вопыту сучаснай беларускай нацыі.

Афармленне атарэферата адпавядае патрабаванням «Інструкцыі аб парадку афармлення кваліфікацыйнай навуковай работы (дысертацыі) на атрыманне вучоных ступеняў кандыдата і доктара навук, аўтарэферата і публікацый па тэме дысертацыі» у рэдакцыі пастановы Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2022 г. № 5.

Вывучэнне зместу аўтарэферата дысертацыі Панова С. В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» дазваляе зрабіць выснову аб адпаведнасці саіскальніка навуковай кваліфікацыі доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Прафесар кафедры агульнай і дашкольнай
педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі
дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»,
доктар педагагічных навук, прафесар Г.В. Торхава

начальника ОК БГПУ
«12» 02 2025 г